**СЛАВА ВЯЛІКАМУ КАСТРЫЧНІКУ, ЯКІ АДКРЫЎ НОВУЮ ЭПОХУ Ў ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА!**

*(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 64-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ).*

## ВІНШУЕМ

**калектыў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, які заняў першае месца сярод навукова-даследчых устаноў Маскоўскага раёна Мінска па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за дзевяць месяцаў першага года адзінаццатай пяцігодкі.**

**На нарадзе кіраўнікоў і сакратароў партыйных арганізацый прадпрыемстваў і устаноў раёна першы сакратар Маскоўскага райкома партыі Б. А. Саўчанка уручыў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі Пераходны Чырвоны Сцяг Маскоўскага РК КПБ і выканкома Савета народных дэпутатаў. Назва калектыву-пераможцы будзе занесена на раённую Дошку гонару.**

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
5 ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 31 (1331)
Выходзіць раз у тыдзень
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

# НАМ ШЛЯХ АЗАРАЕ КАСТРЫЧНІК

Рэвалюцыйнае абнаўленне свету, пачатае Вялікім Кастрычнікам, развіваецца і мацнее, справа міру, прагрэсу і сацыялізму неадольна ідзе наперад і перамагае. Усё гэта мы з найбольшай яскравасцю ўсведамляем напярэдадні самага велічнага свята савецкага народа — свята Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Палымнеюць над Савецкай краінай чырвоныя сцягі. У святочных дэманстрацыях быццам зліваецца напружаны гул самай мірнай у свеце бітвы за ўраджай і сполахі касмічных стартаў, размераны рытм работы заводаў, фабрык, электрастанцый, звонкасць рэек Байкала - Амурскай магістралі, гарачы подых цаліны. Наш гонар за сваю краіну і наша перакананасць у перавагах сацыялістычнага ладу жыцця за 64 гады ўзмужнелі і загартаваліся грандыёзнасцю спраў, веліччу планаў, што вызначае партыя, кіруючая і натхняючая сіла савецкага грамадства.

З чарговай гадавінай пераможнага Кастрычніка супадае знамянальная для нашай рэспублікі падзея — 60-годдзе Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, да якога наш калектыў падышоў са значнымі поспехамі ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, асветы і культуры, з вялікімі навуковымі дасягненнямі. І таму калона БДУ ў дзень свята на галоўнай плошчы сталіцы рэспублікі адлюструе плён 60-гадовых намаганняў усяго нашага калектыву, а таксама сённяшнія поспехі ў вучобе, працы і навуковых даследаваннях, вынікі апошняга працоўнага семестра, шматлікія падзякі за дапамогу сельскім працаўнікам, перамогі студэнтаў на ўсесаюзных конкурсах, новыя дасягненні вучоных. Усё гэта наш уклад у выкананне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

Будзем вартыя свайго часу, дарагія таварышы!

Са святам!

**РЭКТАРАТ**
**ПАРТКОМ**
**МЯСЦКОМ**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**
**ПРАФКОМ**



"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

· Учора · Сёння · Заўтра ·

### КАМІТЭТ НАРОДНАГА

**кантролю універсітэта абмеркаваў пытанне аб выніках праверкі падрыхтоўкі да работы ў зімовых умовах інтэрнатаў. Дырэкцыі студгарадка і камендантам, якія прысутнічалі на пасяджэнні, быў выказаны шэраг канкрэтных заўваг і прызначаны тэрміны выпраўлення адзначаных недахопаў.**

**Члены КНК абмеркавалі таксама вынікі праверак правільнасці залічэння абітурыентаў з высокім прахадным балам, выкарыстання універсітэцкага аўтатранспарту, заслухалі інфармацыю аб першых у гэтым годзе занятках школы народных кантралёраў.**

**Т. САХАШЧЫК.**

### КАНСУЛЬТАЦЫЙНЫ ПУНКТ

**па пытаннях грамадска-палітычнай практыкі створаны пры камітэце камсамола ФПМ. Тут штодзённа дзяжураць члены камітэта камсамола і сакратары камсамольскіх арганізацый кафедраў, якія аказваюць дапамогу сакратарам пярвічных камсамольскіх арганізацый, членам групавых бюро, кожнаму, каму спатрэбіцца, растлумачыць больш глыбока палажэнне аб ГПП, дапамогуць скласці комплексны план.**

**А. САТОЛІН,**
**сакратар камітэта камсамола ФПМ.**

### З КАНЦЭРТАМ

**у міжнародны маладзёжны цэнтр «Юнацтва» выязджалі народны аркестр народных інструментаў, фальклорны ансамбль і лаўрэаты фестываляў палітычнай песні А. Ацьман, А. Булыга, У. Васіленка. Прадстаўнікі мастацкай самадзейнасці універсітэта былі цёпла прыняты і атрымалі падзяку кіраўніцтва маладзёжнага цэнтра.**

**Э. АНІСЕНКА,**
**мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.**



**НА ЗДЫМКУ: у час знаёмства з дасягненнямі навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем.**

**Фота В. ШАЧАКА.**

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ і савецкая дзяржава пастаянна праяўляюць клопат і ўвагу да Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Сведчаннем гэтага з'яўляецца нядаўні рабочы візіт у БДУ сакратароў ЦК КПБ таварышаў Уладзіміра Ігнатавіча Бровікава, Аляксандра Трыфанавіча Кузьміна, міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Мікалая Максімавіча Мяшкова, намесніка загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ Віктара Паўлавіча Кузьмянкова.

У час візіту госці пазнаёміліся з дасягненнямі універсітэта ў развіцці навукі і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, агледзелі праект новага універсітэцкага комплексу. Потым яны наведалі навукова-даследчы інстытут прыкладных фізіка-хімічных праблем, хімічны факультэт, кафедру гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, факультэт журналістыкі, навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі.

Госці выказалі шэраг прапаноў і пажаданняў па далейшаму развіццю універсітэта.





Як мы паведамлялі ўжо, Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна ўзнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ГДР.

**На здымках:** Ганаровую грамату ўручае рэктару універсітэта, акадэміку АН БССР У. А. Беламу Генеральны консул ГДР у Мінску С. Бернатэк; у час мітынгу.

Фота **В. Шачака.**

## XXXIII прафсаюзная канферэнцыя

29 КАСТРЫЧНІКА адбылася XXXIII справаздачна-выбарная студэнцкая прафсаюзная канферэнцыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. З выбраных 700 дэлегатаў прысутнічалі 673. Са справаздачным дакладам выступіў старшыня прафкома М. М. Дрозд. Заслуханы справаздачы рэвізійнай камісіі, праўлення студэнцкага клуба, спартыўнага клуба. Потым выступілі: С. А. Марозава — старшыня спартыўна-аздараўленчай камісіі прафкома, студэнтка V курса гістфака; Н. А. Шарамет — прафорг, студэнтка II курса юрфака; М. А. Лахвіч — старшыня прэс-цэнтра прафкома, студэнт IV курса журфака; Ч. М. Лобач — старшыня прафбюро філфака, студэнт IV курса; М. П. Баранава — дацэнт кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду; В. М. Дзюк— старшыня прафбюро біяфака; Р. А. Малюковіч — дэкан па рабоце з замежнымі навучэнцамі; Н. А. Янушкевіч — староста ансамбля «Крыжачок»; У. С. Багданаў — прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню; П. Л. Салаў — намеснік сакратара парткома; Я. Д. Пашкевіч — сакратар Мінскага абкома прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навучальных устаноў.

Адбыліся выбары прафкома, рэвізійнай камісіі, праўлення студэнцкага клуба.

Старшынёй прафкома выбраны М. М. Дрозд, намеснікамі— А. Д. Кішкевіч, Н. М. Туромша.

# МЫ ЗА МІР, ЗА ДРУЖБУ...



**РАДКІ З ПІСЬМАЎ ЮНАКОЎ І ДЗЯЎЧАТ РОЗНЫХ КРАІН СВЕТУ, ЯКІЯ НАВУЧАЮЦЦА НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ Ў БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ. НЯДАЎНА ЯНЫ НАВЕДАЛІ МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС «БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ-ГЕРОЙ».**

## КАБ НЕ БЫЛО ВАЙНЫ

22 чэрвеня 1941 года мірную ціхую раніцу парушыў гул самалётаў, узрывы бомбаў і снарадаў. Так пачалася Вялікая Айчынная вайна. Гэты гадзіннік, знойдзены ў развалінах Брэсцкай крэпасці, першая ахвяра вайны, нямы сведка той страшнай раніцы. Абгарэлы, з пабітым шклом, ён заціх назаўжды, яго стрэлкі няўмольна спыніліся на лічбе чатыры. Сёння ён заняў сваё месца ў музеі крэпасці.

Студэнты з Танзаніі, ЙАР, Конга, Keніі, Мадагаскара прыехалі ў Брэст, каб пазнаёміцца з легендарнай гісторыяй крэпасці-героя, якая першаю прыняла на сябе ўдар фашысцкай Германіі. Мы, юнакі і дзяўчаты з розных краін свету, былі глыбока ўражаны ўбачаным і пачутым. Больш месяца змагаліся абаронцы пагранічнай заставы. Не хапала зброі, медыкаментаў, не было прадуктаў харчавання, вады, а яны зноў і зноў падымаліся ў штыкавую атаку, паміралі, але не здаваліся. Надпісы на сценах гавораць аб тым, што салдаты змагаліся да апошняй кроплі крыві, абараняючы сваю Айчыну.

Многа гора прынесла вайна людзям. Хочацца толькі аднаго, каб народы свету зразумелі: вайны не павінна больш быць.

**РАСУЛУНДЖАТУВУ НАРСУА ЭМЕ (Мадагаскар).**

## Урок мужнасці

Упершыню ў жыцці сваімі вачыма я ўбачыў Брэсцкую крэпасць, яе паўразбураныя ад бомбаў і куль сцены. Прайшоў ад Мухаўца да крэпасці. Для колькіх людзей гэты адрэзак шляху ў жыцці быў развітальным! Доўга стаяў ля кампазіцыі «Смага»... Менавіта тут, у цытадэлі, я ўбачыў гераізм савецкіх людзей у час Вялікай Айчыннай вайны. Сорак гадоў назад тут больш месяца змагаліся савецкія салдаты. А колькі загінула жанчын і дзяцей.

Людзі планеты! Памятайце аб гэтым. Не дайце амерыканскаму імперыялізму і яго саюзнікам па НАТА развязаць трэцюю сусветную вайну!

Ніколі не забыць мне ўбачанае і пачутае аб Брэсцкай крэпасці. Якім духоўна прыгожым і моцным быў чалавек, што напісаў на сцяне крэпасці: «Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма». Крывёю сваёй, чыстым сваім сумленнем і апошнімі сіламі напісаны гэтыя простыя словы.

Яшчэ не раз прыеду я ў Брэсцкую крэпасць. Будуць прыязджаць, прыходзіць савецкія людзі, людзі з розных краін свету. Для кожнага такая паездка быццам урок мужнасці, вера ў тое, што вайна не павінна паўтарыцца ніколі.

**БЕТРУ ЛАКЕУ (Эфіопія).**

## БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ, ЛЮДЗІ!

Брэсцкая крэпасць. Насустрач ідуць людзі са схіленымі галовамі. Страшэнна ціха. Жанчыны выціраюць хусцінкамі вочы. Чырвоная, быццам акрываўленая дарожка, вядзе нас да ўваходу. Кожны думае штосьці сваё, але сэрцы ўсіх пачынаюць біцца мацней.

Быццам здарылася штосьці непапраўнае, быццам хтосьці адлічвае секунды. Чуецца нарастаючы гул самалёта, візг бомбаў, куль, узрывы гранат. Мы глядзім у неба, але яно яснае. Хочацца павярнуцца назад. Але быццам чуецца голас: «Глядзіце, слухайце, запамінайце! Вы павінны ведаць і расказаць усім, як мы загінулі!»

Моўчкі стаім і глядзім на дзверы каземата, упрыгожаныя піянерскімі гальштукамі. Прайшла нявеста ў белай сукенцы, жаніх, іх сваякі і знаёмыя. Яны прыйшлі з удзячнасцю і павагай тым, каму абавязаны сваім жыццём. Хацелася б пажадаць гэтым незнаёмым людзям шчаслівай будучыні. Галоўнае, каб быў мір. «Навучыце і сваіх дзяцей ненавідзець вайну, каб ніколі не паўтараўся лёс крэпасці. Не дайце вайне дарогу да знішчэння вашага шчасця...»

А побач ціха цячэ рака Мухавец. Яна многае ведае аб тым далёкім часе. Цярплівы ты, Мухавец. І калі паміралі ад смагі байцы, калі крычалі дзеці, плакаў і ты. Мы разумеем цябе, Мухавец!

**Вікі НЦЕЦЕМА (Танзанія).**

## КРЭПАСЦЬ МІРУ І КРЭПАСЦЬ ЛЮБВІ

Час залячыў раны зямлі. Даўно зараслі травою і кветкамі месцы былых баёў. Ды толькі ў Брэсцкай крэпасці — кожны камень — памяць аб мінулай вайне. Тут мы ясна адчулі, як праходзілі баі, як наступалі фашысты, і як змагаліся і паміралі савецкія салдаты. Мы ганарымся вамі, воіны! Навечна застануцца ў нашай памяці вашы імёны.

Брэсцкая крэпасць — крэпасць міру і крэпасць любві. Любілі абаронцы мір, сваю радзіму, сваіх бацькоў, каханых. За сваю любоў яны ішлі на смерць...

В'етнам — мая Радзіма. Лёс В'етнама сугучны з лёсам Брэсцкай крэпасці. Як брэсцкія абаронцы, так і в'етнамскія патрыёты змагаліся пад дэвізам «Загінем, але не здрадзім».

Доўга моўчкі мы хадзілі па цытадэлі. І здавалася, што мы змагаемся разам з салдатамі, што нашы сэрцы б'юцца сугучна з іхнімі.

Сёння над намі мірнае неба. І мы, як самае дарагое, павінны берагчы мір. З поўнай сілай мы зразумелі гэта ў Брэсцкай крэпасці.

**НГУЕН ЦІЭН ХАІ (СРВ).**

## Подзвігу жыць у вяках

Ідуць гады. Жыццё мяняецца разам з часам. Але ёсць падзеі, якім пастаўлены помнікі, якія навечна ўвайшлі ў гісторыю савецкага народа і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва, як бессмяротная песня. Нядаўна, мы, студэнты журфака, наведалі Брэсцкую крэпасць. Мы ішлі па крэпасці, глядзелі і запаміналі. На імгненне, магчыма, кожны уявіў сябе абаронцам цытадэлі. Цяжка было вам, салдаты, але вы не схілілі галавы перад ворагам. Вы выстаялі, дзякуючы мужнасці, веры ў сваю перамогу, гераізму і бязмежнай любві да Радзімы.

З вялікай цікавасцю пазнаёміліся з экспанатамі музея, уважліва ўглядаліся ў здымкі абаронцаў: Кіжаватава, Зубачова, Фаміна... Не забыць нам вашыя прозвішчы, якія сталі для нас сімвалам стойкасці, мужнасці савецкіх воінаў, іх масавага гераізму, высокага разумення свайго абавязку перад Радзімай.

Доўга стаялі перад магіламі загінуўшых і думалі. Вам, дарагія салдаты, не ўбачыць той шырокай і роўнай дарогі, па якой мы сёння прыехалі ў Брэст. Вам не вярнуцца ў свой дом да маці, не сустрэцца з каханай. Вам не ўбачыць і сённяшні Брэст — прыгожы і вялікі горад. Але, дзякуючы вам, спакойна жывуць, гадуюць унукаў вашы маці, радуюцца сонцу дзеці вашых сясцёр, расце і квітнее ваша Радзіма. Ваш подзвіг жыве ў нашых сэрцах, нашай павазе да вас. Вы — героі, а героі не паміраюць. Яны жывуць у справах і думках суайчыннікаў.

Сёння Імперыялісты ЗША імкнуцца развязаць новую вайну, якая можа прывесці наш свет да катастрофы. Лёс Брэсцкай крэпасці застаўляе нас задумацца аб дні сённяшнім і дні мінулым, вучыць нас ісці да канчатковай перамогі.

**ЗЫОНГ СУАН ШОН (СРВ).**

---

**Матэрыялы падрыхтавала супрацоўніца аддзялення па рабоце з замежнымі студэнтамі факультэта журналістыкі Л. Атрушкевіч.**

● СУПРАЦОЎНІЦТВА «БДУ — «ІНТЭГРАЛ»

# Грані мэтавай падрыхтоўкі

НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ рэвалюцыя прад'яўляе з кожным годам павышаныя патрабаванні да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, да іх адпаведнасці сучасным рубяжам навукі і тэхнікі, хутчэйшай адаптацыі па месцу размеркавання. У пэўнай ступені паспяховаму вырашэнню гэтых задач садзейнічае мэтавая падрыхтоўка студэнтаў старэйшых курсаў.

Мэтавая падрыхтоўка можа існаваць у некалькіх варыянтах. Адным з найбольш вядомых з'яўляецца так званы «фізтэхаўскі» метад. Пэўны варыянт якога існуе на нашым факультэце ў рамках супрацоўніцтва з Акадэміяй навук БССР. Такой падрыхтоўцы садзейнічае прыцягненне вядучых вучоных АН БССР да навучальнага працэсу, актывізацыя НДР студэнтаў у акадэмічных інстытутах і, вядома, стварэнне базавых кафедраў. Я не стаўлю мэтай аналіз фізтэхаўскай сістэмы. Перайду да асноўных аспектаў іншага метада мэтавай падрыхтоўкі — «міэтаўскага», дакладней яго мадыфікацыі, рэалізаванай у рамках вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання «БДУ-«Інтэграл».

Прынцыпы гэтай падрыхтоўкі можна сфармуляваць так: рэальнае прыцягненне студэнтаў да НДР і ВКР непасрэдна ў аб'яднаннях, стварэнне ў аб'яднанні вучэбнай базы для выканання цыкла лабараторных работ; увядзенне ў вучэбную праграму курсаў лекцый па навейшай тэхніцы, прыцягненне вядучых работнікаў аб'яднання да навучальнага працэсу, прыцягненне супрацоўнікаў БДУ да НДР па тэматыцы «Інтэграла». Істотнай асаблівасцю гэтай падрыхтоўкі з'яўляецца тое, што яна ахоплівае ўсю вучэбную групу, а не выбарачна частку студэнтаў.

Формы работы кафедры ў рамках мэтавай падрыхтоўкі пастаянна ўдасканальваліся і дапаўняліся. У аб'яднанні сёння выконваюцца курсавыя і дыпломныя даследаванні, праводзяцца студэнцкія навуковыя канферэнцыі, пастаўлены 22 лабараторныя работы. Паказчыкам эфектыўнасці з'яўляецца тое, што ВА «Інтэграл» імкнецца пакінуць у сябе ўсю групу выпускнікоў, якія прайшлі мэтавую падрыхтоўку. На думку кіраўніцтва аб'яднання, мэтавая падрыхтоўка дазваляе ліквідаваць этап адаптацыі маладых спецыялістаў, які звычайна працякае год — паўтара.

Сёлета ў ВА «Інтэграл» створаны філіял кафедры фізікі паўправаднікоў, што палепшыць узаемадзеянне факультэта і аб'яднання ў фарміраванні перспектыўнай праграмы вучэбна-навуковага супрацоўніцтва, павысіць якасць вучэбнага працэсу і навукова-даследчай работы, замацуе традыцыйныя сувязі паміж нашымі арганізацыямі.

**А. ПАТРЫН,**
**дацэнт кафедры фізікі паўправаднікоў.**

# ДАРЫЦЬ РАДАСЦЬ

ГЭТЫ ВЕЧАР нічым не адрозніваўся ад іншых кастрычніцкіх вечароў — гэтак жа холадна, такі ж самы імжэў дожджык. Але галоўнае заключалася ў тым, што гэта быў вечар 31 кастрычніка — традыцыйная дата адкрыцця тэатральнага сезона ТВФ — «Тэатр Вялікай Фізічнай», а прасцей кажучы, студэнцкага народнага тэатра БДУ. Аб адкрыцці ведалі даўно, на яго запрашалі афішы; аматары, прыхільнікі, бацькі, педагогі і проста цікаўныя з нецярплівасцю чакалі яго, з усёй сур'ёзнасцю рыхтаваліся артысты. Рыхтаваліся так, каб зрабіць сваю першую ў гэтым тэатральным сезоне сустрэчу з гледачом сапраўдным святам. Гэта адчувалася адразу, як толькі прыйшоўшы траплялі ў стары фізічны корпус: маляўнічыя плакаты, фотаздымкі са сцэнамі са спектакля, насценгазета тэатра, эмблемы, якія ўручаліся гасцям пры ўваходзе... Урачыстасць і хваляванне панавалі тут. І вось, нарэшце:

—Мы адкрываем свой другі тэатральны сезон... У праграме — першае: спектакль па аднайменнай п'есе Аляксандра Валодзіна «Дзве стралы»; другое: «мініпея-рэвю»— аб тым, як мы жывём...

**Не ведаю, як для каго, але мне здаецца, што для артыста самы лепшы, самы шчаслівы момант у жыцці — гэта, калі ён выходзіць на сцэну. Хвалюючае святло пражэктараў, цішыня залы і сотні вачэй, якія звернуты на цябе. Вачэй уважлівых, зачаравана чакаючых цуда. І вось яно пачынаецца...**

На сцэне — барацьба. Барацьба паміж дабром і злом, паміж пачуццямі сапраўднымі і фальшывымі, баязлівасцю і няпраўдай. І галоўнае не ў тым, хто забіў Доўгага, не ў тым, што стрэлы былі Вушастага, а стралялі імі Хадок і Даўганосік. Род развальваецца, кожны за сябе, кожны для сябе. Аб гэтым гаворыць Глава Роду. Ханжаства, крывадушнасць імкнуцца стаць на п'едэстал. Ці пераможа гэта над дабром і справядлівасцю? Ці не зніклі яшчэ праўда, любоў, адказнасць за сябе, свае ўчынкі, за ўсіх перад усімі?

**Каторы ўжо раз пашчасціла глядзець спектакль, але па-ранейшаму кранаюць сэрца сцэны кахання. Вушасты і Дзяўчына, яе вочы — колькі ў іх цеплыні, пяшчоты і болю! Яно ёсць, каханне. Яно ўзвышаецца над усім, яно — сапраўднае. І не зможа больш Даўганосік здраджваць сяброўству, пакарацца подласці, пераступіць праз баязлівасць.**

...Калі апускаецца заслона і гасне святло, свет тэатральных герояў яшчэ доўга не пакідае нас. Яшчэ гучаць іх галасы, яшчэ бачыш натхнёныя твары артыстаў. Развітвацца не хочацца...

І свята працягвалася. «Капуснік» —«мініпея-рэвю» альбо вясёлы парад песень, жартаў і танцаў на паўгадзіны перанёс усіх гасцей у атмасферу жыцця ТВФ, дзе Вушасты — ужо проста Сярожка Розум, Глава Роду — Рома Кветнер, Удава — Лена Зайцава, Дзяўчына — Оля Дзямідава, і ўсе іншыя — проста свае, самыя блізкія, самыя надзейныя, самыя лепшыя сябры. Вялікая дружная сям'я. І радасць знаёмства з ёй атрымалі ўсе, хто прыйшоў на адкрыццё сезона ў апошні дзень кастрычніка.

**І. САВЕТКІНА.**

● ФОТАРЭПАРТАЖ

# ВЯЛІКАМУ КАРАБЛЮ...



БЕТОННАЯ ДАРОЖКА, што шэрым лязом рассякае парадзелы ад восеньскіх вятроў лес, крута зварочвае ўлева, і перад намі раптам вырастае прыгожы шматпавярховы будынак біялагічнага факультэта. Пабудаваны ў сучасным стыле, ён нагадвае вялізны карабель. Шырокія вокны, блакітныя, нібы ілюмінатары, яшчэ больш падкрэсліваюць гэта падабенства.

— На біялагічным займацца вельмі цікава, — гаворыць студэнтка IV курса Надзея Тоўсцікава. Яна — дзяжурная і першая, хто сустрэў нас на факультэце. — Зрэшты, праз трыццаць мінут будзе перапынак, і вы зможаце спытаць аб гэтым у любога студэнта — адказ будзе адзін і той жа. А пакуль наведайце наш заалагічны музей. Ён знаходзіцца на першым паверсе...

Праз некалькі хвілін мы з цікавасцю разглядалі казачны свет звяроў і птушак, што запоўнілі дзве залы музея. Вось збегліся на палянцы стройныя алені, вось п'е ваду з крыніцы трапяткая лань, а там расцягнуўся на сонцы даўжэзны пітон.

— Гісторыя заалагічнага музея БДУ імя У. І. Леніна, — расказвае яго загадчык Л. Д. Бурко, — бярэ свой пачатак з 1921 года. Тады пры кафедры заалогіі былі сабраны першыя экземпляры млекакормячых, птушак, амфібій, паўзуноў, рыбаў і беспазваночных. Цяпер у фондзе музея налічваецца звыш 5,5 тысяч экспанатаў. Асноўнае прызначэнне музея — вучэбнае і навукова-эксперыментальнае. Дарэчы, сёння з яго экспанатамі знаёмяцца студэнты II курса факультэта дашкольнага выхавання педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

Падыходзім да кіраўніка групы. Гэта дацэнт Маргарыта Іванаўна Жабінская. Ад яе даведваемся, што студэнты МДПІ імя А. М. Горкага частыя наведвальнікі музея. Яны знаёмяцца тут з жывёльным светам нашай краіны і розных прыродных зон.

У студэнтаў II курса сёння практычныя заняткі. У другой групе малы практыкум па ніжэйшых раслінах вядзе выкладчык кафедры батанікі дацэнт М. А. Лемяза.

— Будучы біёлаг, — тлумачыць Мікалай Аляксеевіч, — павінен спалучаць у сабе якасці вучонага-тэарэтыка і вучонага-даследчыка. Іменна таму студэнты біялагічнага факультэта разам з тэарэтычнымі ведамі набываюць практычныя навыкі работы з разнастайнымі прыладамі і тэхнічнымі сродкамі. А што датычыць адносін да вучобы, дык гэта пакажуць адказы.

І вось ужо «выдатна» атрымлівае стараста групы Алена Хоміч, добра адказвае Алена Голас. Не адстаюць ад сваіх таварышаў і іншыя студэнты. Па твары М. А. Лемязы відаць: выкладчык задаволены.



У суседняй аўдыторыі першакурснікі рыхтуюцца да практычных заняткаў па анатоміі чалавека: паўтараюць будову чэрапа, класіфікацыю мышцаў галавы, шыі, тулава.

— Алег, дзе знаходзіцца лобная косць? А дзе клінападобная?..

— Пакажыце, калі ласка, жавальныя мышцы.

— Давайце папросім Канстанціна Іванавіча растлумачыць гэта пытанне...

Дацэнт К. І. Грышан выкладае на біялагічным факультэце не адзін год. Свой прадмет ведае дасканала, цікава вядзе практычныя. Ці не таму так любяць і паважаюць яго студэнты?

— Канстанцін Іванавіч, давайце без перапынку...

— Канстанцін Іванавіч, як называецца гэта мышца на лацінскай мове?

Ажыўлена ў камітэце камсамола. Заўтра пасяджэнне. Таму Ірына Курыловіч, адказная за работу сектара маральна-этычнага выхавання, сабрала кам-

**(Заканчэнне на 4-й стар.).**



● ФОТАРЭПАРТАЖ

# ВЯЛІКАМУ КАРАБЛЮ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).**

самольскі актыў IV курса: неабходна зацвердзіць план работы сектара. Камітэт камсамола біялагічнага факультэта імкнецца працаваць так, каб студэнтам было цікава не толькі вучыцца, але і адпачываць.

Восеньскія прыцемкі рана кладуцца на зямлю. Загараецца святло ў вокнах будынка, што падобны на вялікі карабель — працоўны дзень на біялагічным факультэце працягваецца.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**В. ШАЧАК** (фота).





● СПОРТ ●

## Восеньскі лёгкаатлетычны

СТАЛА ЎЖО ТРАДЫЦЫЯЙ спартыўны сезон у новым навучальным годзе адкрываць стартамі першакурснікаў, або дакладней — першынствам па кросу сярод першых курсаў факультэтаў на прыз газеты «Беларускі універсітэт». Для студэнтаў-першакурснікаў — гэта першыя вялікія спартыўныя спаборніцтвы за час вучобы ва універсітэце. Яны прысвячаліся 60-годдзю БДУ імя У. І. Леніна. Таму правядзенне іх патрабавала высокай адказнасці ад арганізатараў. Як-ніяк, ад таго, на якім узроўні пройдуць першыя спаборніцтвы, залежыць настрой студэнтаў на ўвесь спартыўны сезон.

Адразу скажу, што спартыўнае свята прайшло паспяхова. Дрэннае, дажджлівае надвор'е, пранізлівы вецер не сталі перашкодай для 1230 удзельнікаў кросу. На універсітэцкім стадыёне чакалася упартая спартыўная барацьба. Перад пачаткам кросу адбыўся парад удзельнікаў. Старэйшы работнік кафедры фізвыхавання і спорту М. А. Шэйнеман аддаў рапарт старшыні спартклуба Н. М. Кройтэр аб гатоўнасці ўдзельнікаў да спаборніцтваў. Затым ад імя рэктарата і парткома БДУ імя У. І. Леніна да першакурснікаў звярнуўся старшыня савета ветэранаў вайны універсітэта І. В. Марчанка.

Выступленне кожнага факультэта было распісана па мінутах. Не было недакладнасцей і ў рабоце суддзяў. Адным словам, справа заставалася толькі за самімі студэнтамі. Ад таго, наколькі ўдала яны справяцца са сваімі дыстанцыямі і залежыла канчатковае размеркаванне месц.

Як паказалі выступленні, вынікі на кросавых дыстанцыях былі некалькі вышэйшыя, чым у мінулы год. Сярод мужчын першым пераадолеў кіламетровую дыстанцыю студэнт факультэта прыкладной матэматыкі А. Міхейкін (2 мін. 46 сек.). Другое і трэцяе месцы былі за гісторыкамі С. Карсунам і А. Гаруновічам, адпаведна іх вынікі складаюць 2.47.5 і 2.51. Упартая барацьба сярод жанчын была на дыстанцыі 500 м. Усяго паўсекунды аддзяляе другое і трэцяе месцы першакурсніц В. Першынай (юрфак) і А. Пількова (фізфак). Радуе, што трэці вынік Алы Пількова (1.30) значна вышэйшы за мінулагодні ў пераможцы на дыстанцыі 500 м. А першае месца з добрым вынікам 1 мінута 24 секунды было за студэнткай юрфака Ірай Данільчанка.

Як бачым, сярод першакурснікаў ёсць многа таленавітых бегуноў, што, безумоўна, павінна стаць добрым падмацункам для зборнай універсітэта па лёгкай атлетыцы.

...Восеньскі лёгкаатлетычны крос — гэта не толькі дэманстрацыя талентаў. Крос павінен быў даць адказ на пытанне, якая спартыўная падрыхтоўка ва ўсіх удзельнікаў кросу, што ўяўляе сабой іх спартыўная каманда як калектыў аднакурснікаў. Прыемна было назіраць, з якім натхненнем выступалі ўдзельнікі кросу. Як сапраўдныя спартсмены яны змагаліся з кожным метрам дыстанцыі. Здзіўляе аднак той факт, што некаторыя першакурснікі аднесліся да выступлення не вельмі сур'ёзна. У выніку каманда страціла дарагія ачкі, якія набывалі іншыя таварышы. Так здарылася і ў першакурснікаў журфака. Камандзе не ўдалося паўтарыць мінулагодняга поспеху, калі журфак стаў уладальнікам спецыяльнага прыза рэдакцыі. Сёлета камандзе журфака дасталося толькі сёмае месца.

Слаба выступілі таксама першакурснікі радыёфізічнага, філалагічнага, біялагічнага факультэтаў.

Вось як выглядае выніковая табліца:

1. **Гістфак (180)**
2. **ФПМ (155)**
3. **Юрфак (140)**
4. **Мехмат (110)**
5. **Геафак (100)**
6. **Фізфак (90)**
7. **Журфак (80)**
8. **Хімфак (70)**
9. **Біяфак (60)**
10. **Радыёфізікі і электронікі (50)**
11. **Філфак (40)**

(У дужках — колькасць ачкоў).

Спаборніцтвы закончаны. 256 удзельнікаў выканалі нарматывы на залаты значок ГПА, 362 — на сярэбраны. Застаецца пажадаць толькі першакурснікам і ў далейшым актыўнага ўдзелу ў спартыўным жыцці універсітэта.

**І. ПАПКО,**
**студэнт журфака.**

● ТУРЫСЦКІМІ МАРШРУТАМІ

# ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ, ГОРНЫ АЛТАЙ...

ШМАТ ТУРЫСЦКІХ маршрутаў пракладзена па Горнаму Алтаю. Адзін з іх выбралі сёлета турысты-воднікі спартыўнага таварыства «Буравеснік». Група, у склад якой уваходзілі супрацоўнікі БДУ імя У. І. Леніна, НДІ ПФП імя А. Н. Севчанкі, студэнты і выкладчыкі БПІ, прайшла маршрут 4-й катэгорыі складанасці па алтайскіх рэках Урсул і Катунь.

Нямала сюрпрызаў і хваляванняў паднёс нам наравісты Урсул. Рака з намаганнямі пракладвае сабе дарогу сярод нагрувашчванняў скал і каменняў, а часам сціскаецца сценамі каньёнаў, ствараючы каскады магутных парогаў. Гэты ўчастак маршруту паслужыў праверкай нашай тэхнічнай і псіхалагічнай падрыхтоўкі, і разам з тым добрай школай для далейшага ўдасканалення турысцкага майстэрства. Нездарма Ніжні Каньён на Урсуле залічваюць да перашкод 5-й катэгорыі складанасці, праходжанне якіх даступна толькі добра падрыхтаваным групам.

А вось, нарэшце, і Катунь, сустрэчы з якой мы чакалі з вялікім хваляваннем. Ці зможам мы на нашых малых па памерах надзіманых плытах утаймаваць гэты равучы паток, які дае пачатак вялікай сібірскай рацэ Абі?

Катунь накінулася на нас двухметровыміваламі, пеннымі катламі і варонкамі. Часам мы адчувалі сябе як у моры, што штарміць. Каманды капітана плыта губляліся ў грукаце вады, даводзілася толькі здагадвацца аб іх змесце. Потым рака сціхла, каб назапасіць сілы для новага кідка наперад. Вось тут мы і зразумелі, што школа Урсула не прайшла дарма: наладжаныя дзеянні экіпажаў забяспечылі паспяховае праходжанне ўсіх складаных перашкод, дазволілі з гонарам выходзіць са, здавалася б, безнадзейных сітуацый. І гэта было не толькі выпрабаванне нашай тэхнікі, але і выпрабаванне характараў. Бадай, галоўны вынік як раз у тым, што ўдзельнікі пахода не падвялі, не завагаліся.

Кожны край па-свойму цудоўны, але нам здавалася, што няма нічога прыгажэй, убачанага намі на Алтаі. Велічныя горы абступалі раку з усіх бакоў, пейзажы змяняліся адзін другім, уражвалі сваёй непаўторнасцю. На маршруце нам спадарожнічала цудоўнае сонечнае надвор'е, магчыма яшчэ і таму настрой быў выдатным. Адзін з дзён мы прысвяцілі знаёмству з наваколькымі гарамі, калі зрабілі пешы выхад па даліне ракі Сумульты.

Шкада было развітвацца з Горным Алтаем, хацелася усё запомніць і «захапіць» з сабой. Але мы спадзяёмся, што прыедзем сюды яшчэ не адзін раз. Да новых сустрэч, прыгажун Алтай!

**А. БАРКОВА,**
**малодшы навуковы супрацоўнік кафедры электрафізікі радыёфізічнага факультэта, удзельніца пахода.**



● СПОРТ ●

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**

**5 лістапада 1981 г.**

АТ 02501 Зак. 1715

**220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.**

**ТЭЛЕФОН 20-68-27.**

**Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ**